літаратурнага сілаба-танічнага верша. У яго паэзіі другой паловы XX стагоддзя значнае месца заняў **верлібр** (свабодны верш). Рытміка-інтанацыйны лад верлібра найчасцей і найбольш адэкватна пачаў увасабляць філасофскі роздум паэта, развагу над многімі з'явамі рэчаіснасці. Ва ўсім гэтым выявілася надзвычайнае багацце рытміка-інтанацыйнага ладу вершаў Максіма Танка — ад памераў сілаба-тонікі («Мой хлеб надзённы», «Завушніцы») і да верлібра («Не знаю...», «Ты яшчэ толькі намёк на чалавека...»).

1. Якімі сродкамі і спосабамі ствараецца рытмічны лад вершаванага твора?
2. Інтанацыя залежыць як ад зместу, так і ад формы твора. Пакажыце гэта на канкрэтных прыкладах.
3. Праілюструйце чытаннем вершаў Максіма Танка ўслых багацце іх рытміка-інтанацыйнага ладу.
4. Прывядзіце прыклады, дзе яшчэ, акрамя паэзіі, праяўляе сябе рытм.

# Іван Шамякін

(1921—2004)



*Н. Шчасная.*
У снежныя зімы. Партрэт пісьменніка І. П. Шамякіна

Сёння цяжка ўявіць, якой каласальнай папулярнасцю на працягу доўгіх дзесяцігоддзяў карысталася творчасць Івана Шамякіна. Прычым сучаснымі чытачамі ён прачытваецца па-новаму, і ў творчасці яго адкрываюцца нябачныя раней глыбіні.

Акадэмік Уладзімір Гніламёдаў назваў Івана Шамякіна **«летапісцам дзвюх эпох»** — савецкай і постсавецкай. І сапраўды, І. Шамякін адлюстраваў самае карэннае і галоўнае ў жыцці беларусаў на працягу пасляваеннага пяцідзесяцігоддзя.



Правообладатель Национальный институт образования

Нарадзіўся Іван Пятровіч Шамякін 30 студзеня 1921 года ў вёсцы Карма́ Добрушскага раёна Гомельскай вобласці.

Маці яго была з багатай сялянскай сям'і, бацька — з беднай. Бацька ў 1920-я гады стаў лесніком. Сям'я часта пераязджала. Нейкі час Пятру Шамякіну давялося служыць у лесе каля вялікай вёскі Церуха́ Гомельскага раёна. Там у пятым класе Іван вучыўся з будучай сваёй жонкай — Машай Кротавай. Потым яны сустрэліся ўжо ў Гомелі, дзе ён быў студэнтам тэхнікума будаўнічых матэрыялаў, а яна вучылася ў медвучылішчы. У 1940 годзе Маша стала яго жонкай. Каханне да Марыі Іван Шамякін пранёс праз усё жыццё, увасобіў яе ў шматлікіх жаночых, надзвычай абаяльных, вобразах сваіх раманаў і аповесцей. Асабліва паэтычна ён апісаў юнацкае каханне ў аповесці «Непаўторная вясна».

У 1940 годзе І. Шамякіна прызвалі ў войска. Служыў ён у Мурманску, на зенітнай батарэі, дзе і сустрэў вайну. Вялікую Айчынную прайшоў ад першага дня да апошняга. Разам са сваім дывізіёнам перамяшчаўся з Поўначы ў Польшчу, затым у Германію. Перамогу сустрэў за 30 км ад Берліна. Там жа пачаў пісаць.




▲ Вокладкі кніг Івана Шамякіна

**Першая аповесць «Помста»** адразу выклікала цікавасць, была надрукавана ў 1946 годзе ў часопісе «Полымя». Тады ж Іван Шамякін дэмабілізаваўся, вярнуўся да сям'і, настаўнічаў, пісаў свой першы раман пра партызан Гомельшчыны — на аснове аповедаў блізкіх жонкі, звязаных з партызанамі. У 1951 годзе раман «Глыбокая плынь» быў адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР.

Пасля «Глыбокай плыні» з'явіліся іншыя раманы: «У добры час», «Крыніцы», «Трывожнае шчасце». Апошні — пенталогія, складаўся з 5 аповесцей. З іх першая — «Непаўторная вясна» (1957), аповесць пра каханне, вернасць, чалавечую сардэчнасць, абавязак, патрыятызм.


Правообладатель Национальный институт образования

Звярніцеся да дадатковай літаратуры, інтэрнэт-рэсурсаў і падрыхтуйце паведамленне «Творы І. Шамякіна ў тэатры і на экране».



Кадр з фільма «Вазьму твой боль» (рэж. М. Пташук)

Велізарную папулярнасць не толькі ў Беларусі, але і ў СССР набыў раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні» (1963).

Адчуванне трагізму ў жыцці народа выявіў раман «Вазьму твой боль» (1979). Твор скіраваны супраць абыякавасці людзей, абывацельскай псіхалогіі. Выдатны фільм паводле рамана зняў знакаміты беларускі рэжысёр Міхаіл Пташук.

З 1948 года І. Шамякін з сям'ёю жыў у Мінску. Іван Пятровіч працаваў на ключавых пасадах у Саюзе пісьменнікаў Беларусі, кіраваў выдавецтвам «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя імя П. Броўкі», стаў акадэмікам. Розных ганаровых прэмій і званняў меў шмат: Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, некалькіх Дзяржаўных прэмій Беларусі, Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі, рознага роду імянных літаратурных прэмій, узнагароджаны трыццаццю (разам з ваеннымі) ордэнамі і медалямі. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і БССР, Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР, Старшынёй Беларускага камітэта абароны міру і інш. У 1972 годзе Івану Пятровічу Шамякіну прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка БССР.

Кнігі празаіка выдаваліся на 57 мовах свету. У Кітаі выйшлі амаль усе яго раманы. Асаблівая прыхільнасць кітайскіх чытачоў да беларускага аўтара выклікае здзіўленне ў сучасных навукоўцаў. А прычына яе, відаць, у тым, што Іван Шамякін найбольш яскрава адлюстраваў працэс пераходу сялянскай беларускай нацыі ў нацыю інтэлігентаў. Такі ж працэс перажываў у канцы XX — пачатку XXI стагоддзя і Кітай.



Правообладатель Национальный институт образования

Шмат якія творы пісьменніка ў Беларусі экранізаваны. Ён умеў быць аб’ектыўным і ўхваляў ігру многіх акцёраў, хоць зразумела, што часам уяўляў сваіх персанажаў іншымі.

Даследчыкі заўсёды адзначалі шамякінскую вострую сацыяльнасць, крытычнасць, выдатнае валоданне псіхалагічным аналізам і пры гэтым цудоўнае сюжэтнае майстэрства, якое нязменна трымала чытачоў у напружанні.

І. Шамякін заўсёды верыў у дабро і вышэйшую справядлівасць, і нават у 1990-я гады, перажыўшы смерць блізкіх людзей, прайшоўшы праз крах сістэмы, у якую ўсё ж верыў, нават бачачы яе заганы, не пераставаў лічыць, што ўрэшце дабро перамагае. Галоўнае імкненне І. Шамякіна — жыць па сумленні — абумовіла маральна-этычную вышыню і яго герояў.

Дастаткова актыўна працаваў пісьменнік у 1990-я гады і да самай смерці.

Сябар Шамякіна Алесь Савіцкі ў дні расстання з Іванам Пятровічам пісаў: «На зямлі беларускай — ды наўрад ці толькі беларускай — няшмат адшукаецца кніжных паліц, дзе б не стаяла тая ці іншая кніга шамякінская».

1. «Ва ўсякай біяграфіі прысутнічае эпоха... Стварэнне твора ёсць факт біяграфіі аўтара, біяграфія аўтара ёсць факт гісторыі, гісторыі літаратуры ў прыватнасці. Таму па сваёй сутнасці біяграфія пісьменніка — гэта перажыванне асабістага жыцця ў гісторыі» *(Дзмітрый Ліхачоў)*. Дакажыце на прыкладзе жыцця і творчасці Івана Шамякіна, што біяграфія пісьменніка — паняцце не вузка асабістае, а грамадска-гістарычнае.
2. Чаму Івана Шамякіна называюць летапісцам эпохі?
3. Якія старонкі біяграфіі І. Шамякіна паўстаюць з яго твораў?
4. Прачытайце ў кнізе ўспамінаў Таццяны Шамякінай «Іван Шамякін: вядомы і невядомы» раздзел IV «Жыццё і творчасць І. Шамякіна ў сувязі з рознымі відамі мастацтва». Паразважайце, якое месца займае мастацтва ў жыццёвай і творчай біяграфіі пісьменніка.
5. Карыстаючыся матэрыяламі электроннага рэсурсу і дадатковай літаратурай, падрыхтуйце калектыўны даследчы праект (на выбар): «Архітэктура ў жыцці і творчасці І. Шамякіна», «Выяўленчае мастацтва ў жыцці і творчасці І. Шамякіна» або «Музыка ў жыцці І. Шамякіна».


Правообладатель Национальный институт образования

## Аповесць «Непаўторная вясна»

Пенталогія — структурна-кампазіцыйная форма з пяці асобных твораў (аповесцей, раманаў), звязаных адным сюжэтам і агульнымі героямі. «Трывожнае шчасце» — першая ў беларускай літаратуры пенталогія.

**Адлюстраванне даваеннага жыцця.** Пенталогію «Трывожнае шчасце» сам аўтар найбольш любіў.

Не толькі таму, што твор у вышэйшай ступені аўтабіяграфічны, але і таму, што пісаў яго шчаслівы чалавек. У 1950—1960-я гады жыццё І. Шамякіна поўнае, надзвычай актыўнае і багатае на падзеі. Ён ужо знакаміты і надзвычай папулярны ў народзе, хоць яшчэ дастаткова малады; у яго шмат сяброў, у тым ліку з розных краін; у яго прыгожая і разумная жонка, яго верны памочнік; у іх трое дзяцей. Усё спрыяла творчасці.

Пенталогія ахоплівае часавы перыяд ад пярэдадня вайны да першых гадоў пасляваеннага жыцця.

Героі «Трывожнага шчасця» Пятро Шапятовіч і Саша Траянава ўвасабляюць тую маладую жыватворную сілу, якая супрацьстаяла чалавечай хцівасці і хлусні, бюракратычнай абыякавасці, раўнадушшу.

Уся пенталогія ахоплівае вялікі адрэзак часу і ўлічвае значны гістарычны вопыт народа. Ад адной часткі да другой змяняецца арэна дзеянняў герояў.

У пенталогіі паказана, як у новых жыццёвых абставінах героям даводзіцца змяняць свае пазіцыі, лінію паводзін: спачатку гэта пераход ад вучнёўства да самастойнай працы, ад юнацкай закаханасці да жыцця сям'ёй, потым — надзвычай складанае прывучэнне сябе да ваенных абставін, а ў апошняй аповесці «Мост» — зноў вяртанне да мірнай працы і да сямейнага ладу. Структура вялікага твора мае *форму хвалі*.




▲ Вокладка кнігі І. Шамякіна «Трывожнае шчасце»

Дзеянне першай у пенталогіі **аповесці «Непаўторная вясна»** адбываецца ў 1939—1940 гады. Івану Пятровічу Шамякіну, які



Правообладатель Национальный институт образования

***Прататып***, правобраз, — рэальная асоба, рысы характару, жыццё або асобныя ўчынкі якой паслужылі пісьменніку асновай для створанага ім вобраза літаратурнага.

стаў прататыпам Пятра Шапятовіча, і Марыі Філатаўне, яго жонцы, з якой пісаўся вобраз Сашы Траянавай, у той час было васямнаццаць-дзевятнаццаць гадоў. Яны жылі ў сваім юнацка-прыгожым, паэтычным, вясновым свеце, які, здавалася, мала датычыў свету знешняга. Але нельга сказаць, што час абсалютна не адчуваецца ў творы, што героі заняты пераважна сваімі ўласнымі, надзвычай узвышанымі, але ўсё ж выключна асабістымі перажываннямі. Наадварот, атмасфера эпохі прысутнічае выразна, але яна растворана ў стыхіі юнацкага ўспрымання жыцця.

Аповесць пачынаецца з прыезду Пятра Шапятовіча да сваёй каханай Сашы Траянавай у вёску каля паўднёвабеларускага горада Рэчыцы, дзе дзяўчына па размеркаванні пачала працаваць фельчарам. Мноства бытавых, на першы погляд нязначных, падрабязнасцей ствараюць выразны сацыяльны фон часу. Так, хатняя гаспадыня гераіні скардзіцца на немагчымасць спячы хлеб, бо, каб змалоць муку, неабходна чакаць чаргі на млыне: «Раней у адной нашай вёсцы колькі млыноў было, а цяпер на паўраёна — адзін млын». Здаецца, драбяза, а на самай справе — характэрная прымета 1930-х гадоў.

Якія характэрныя прыметы 1930-х гадоў адлюстраваны ў творах Івана Шамякіна і Валяр'яны Жолтак?



▲ *В. Жолтак*. Вясна. 1930-я гг.



Правообладатель Национальный институт образования

Да вайны сітуацыя з першым і самым важным прадметам для існавання чалавека — хлебам — была ў некаторых месцах дастаткова складаная.

«На снеданне гаспадыня падала халодную бульбу, гуркі і міску сыраквашы. Пятро не звярнуў увагі — звычайнае сялянскае снеданне, дома ён харчаваўся не лепш...» Як высветлілася, беднаватая ежа сведчыла пра няміласць гаспадыні да прыезджага хлопца. Сваю кватарантку Сашу яна карміла намнога больш сытна.

У тэксце аповесці таксама ёсць сведчанне адносна выгляду паселішчаў: «Да вайны новага чалавека здзіўляў знешні выгляд вёсак у гэтым месцы: сярод лесу стаялі пахіленыя хаткі з беднымі агародамі, у той час калі ў вёсках стэпавых, за дваццаць-трыццаць кіламетраў ад лесу, хаты былі адна ў адну — вялікія, новыя, і навокал — багатыя сады. Пасля вайны выгляд вёсак перамяніўся. Гэта былі гады, калі ўсе будаваліся — і той, хто пагарэў, хто не меў дзе жыць, і той, у каго быў добры дах над галавой; усіх ахапіла гарачка будаўніцтва, і кожны лез са скуры, каб зрабіць дах большы і лепшы. Натуральна, што тыя, у каго лес быў пад бокам, адбудаваліся хутчэй і лепш». Такім чынам, вайна — той рубеж, які вызначыў нават змяненне ландшафту.

Маецца на ўвазе Дагавор аб ненападзенні паміж Германіяй і Савецкім Саюзам (пакт Молатава — Рыбентропа), падпісаны ў Маскве 23 жніўня 1939 года наркомам замежных спраў СССР В. Молатавым і міністрам замежных спраў Германіі І. Рыбентропам.

Падчас вандравання, ідучы ўжо ад Сашы да бацькоў, Пятро пачуў пра пачатак вайны ў Еўропе, яшчэ не ведаючы пра яе будучы сусветны характар. Знаёмая Люба з адной з суседніх вёсак паведаміла: «Перадавалі па радыё, што Гітлер напаў на Польшчу. Там ваююць... Дзядзькі баяцца, каб на нас не пайшоў... Кажуць, што ён хоча забраць Польшчу, каб да нашай граніцы дайсці...» Але Пятро, упэўнены ў сваёй палітычнай дасведчанасці, з юнацкім максімалізмам аспрэчвае справядлівыя сумненні і мудрую абачлівасць сталых людзей, відаць, унутрана паставіўшыся да іх асцярожнасці з іроніяй: «Што ты?! Мы толькі дагавор заключылі! Такі дагавор! Аб ненападзе і дружбе!»



Правообладатель Национальный институт образования

Прычым патаемна Пятро, як і многія тагачасныя юнакі, марыў пра вайну, бо «прагнуў гераічнага подзвігу і лічыў, што героем можна стаць толькі на вайне».

А потым мінулі восень і зіма. Герой ездзіў на пераддыпломную практыку ў Заходнюю Беларусь, якая пасля 17 верасня 1939 года далучылася да БССР.

Наступнай вясной, 1940 года, нашмат пасталелы Пятро, пачуўшы паведамленне пра ўступленне немцаў у Парыж, па-сапраўднаму ўстрывожыўся. Ён ужо жанаты з Сашай, і не мара пра подзвігі, а клопат пра блізкага чалавека валодае яго пачуццямі. «Вайна, яе ўяўная рамантыка можа вабіць толькі дзяцей і юнакоў: для чалавека, які зразумеў сэнс жыцця і ўведаў шчасце, вайна не можа не быць страшнай і агіднай».

Так імклівы час і зменлівыя абставіны жыцця, прычым і ў сусветным маштабе, і ў асабістым, хутка робяць іншай псіхалогію чалавека, пазбаўляюць яго юнацкай наіўнасці. Праўда, па-ранейшаму Пятро верыць у магутнасць Чырвонай арміі, упэўнены, што «калі вораг нападзе, то будзе разбіты адразу, за які тыдзень-два». Ніхто тады не прадбачыў свой лёс. Хоць Саша, яшчэ не ўяўляючы рэаліі вайны, прызнавалася, што баіцца яе. А Пятру, ідучы ў армію, куды год таму ён так прагна імкнуўся, ужо было цяжка і трывожна: пачуцці яго складаныя — і патрыятычны парыў, і сум з-за неабходнасці пакідаць каханую.

Жорсткі закон, але таксама абумоўлены неабходнасцю ўмацавання дысцыпліны перад магчымай блізкай вайной. Ёй «дыхае» ўсё ў кнізе.

Як вы расцэньваеце ўчынак Сашы Траянавай? Згадайце творы беларускай літаратуры, у якіх адлюстраваны сітуацыі, што не могуць быць ацэнены адназначна. Магчыма, вы ведаеце такія выпадкі з рэальнага жыцця? Раскажыце пра гэта.

Яшчэ адна прымета часу, якая аказалася надзвычай сур'ёзнай: калі Саша даведалася, што Пятро ў бальніцы, яна вырашыла паехаць да яго ў Гомель, не зважаючы на рабочыя дні. «Незадоўга перад гэтым выйшаў закон, згодна з якім за прагул, за спазненне на работу аддавалі пад суд».

Юнацкае каханне герояў не аддзелена ад часу, ад самай галоўнай падзеі ў жыцці цэлага пакалення — Вялікай Айчыннай вайны. А трывожнае пачуц-



Правообладатель Национальный институт образования

цё ў аповесці «Непаўторная вясна» нарастае спакваля, паступова, кантрастуючы з асабістым шчасцем закаханых. І не толькі ў апісаннях юнацкіх пачуццяў велізарнае значэнне аповесці І. Шамякіна, а перш за ўсё ва ўключанасці лёсу адзінак у лёс пакалення, у рытм часу, у гісторыю.

**Духоўны свет Пятра і Сашы. Паэзія кахання.** Шчасце герояў твора не пазбаўлена некаторых драматычных нотак і ў іх міжасабовых адносінах пад ціскам знешніх абставін. Аповесць выразна падзяляецца на дзве часткі. Першая частка — спатканне закаханых пасля змянення статусу Сашы, на яе першым у жыцці рабочым месцы. Другая частка — сустрэчы ўжо амаль праз год, калі яны сталі мужам і жонкай. Перад першай сустрэчай, у пачатку аповесці, Пятро трывожыцца і адчувае сябе няўпэўнена. Тым больш што Саша стала рэдка пісаць. У хлопца ўзнікла пачуццё беспадстаўнай рэўнасці. Але потым успомніліся светлыя хвіліны іх узаемаадносін.

Яшчэ ў дарозе да каханай у Пятра пастаянна змяняецца настрой: ён у чаканні і трывозе, у рэўнасці і пяшчоце. «Боязь і радасць, трывога і лепшая надзея, няўпэўненасць і юнацкая задзірыстая рашучасць перамяшаліся ў дзіўнае і вельмі салодкае пачуццё». Сустрэча сапраўды адбылася не такая, на якую героі спадзяваліся. Саша разгубілася, са страху вырашыла называць Пятра стрыечным братам.

> Ідэя па́ры назваца кроўнымі родзічамі наіўная і недарэчная, бо сталых людзей, вяскоўцаў, падмануць цяжка, чаго маладыя не разумеюць. Таму і расзлавалася гаспадыня Сашы: не чакала ад дзяўчыны такога недаверу да сябе. А якраз нядобразычлівае стаўленне гаспадыні ў многім абумовіла драматызм першай сустрэчы закаханых на месцы Сашынай працы.

Увогуле ж тут мелі месца розныя абставіны: і разгубленасць Пятра ў новай абстаноўцы, і яго рэўнасць, і змены ў самой Сашы, і халоднасць гаспадыні, і сум хлопца без Сашы, якая шмат часу аддавала рабоце, нягледзячы на яго прыезд. Героі яшчэ вельмі наіўныя, яны не ведаюць жыцця: сям’я, школа і тэхнікумы — вось і ўвесь іх жыццёвы вопыт. А пачуцці ўспыхваюць імпульсамі. Вось Саша, убачыўшы Пятра, хоча схавацца. Але тут жа разумее, што гэта «і наіўна, і непрыгожа, і жорстка». Вось Пятро пакутуе ад рэўнасці, калі Саша не прыходзіць дадому. Але, даведаўшыся, што дзяўчына



Правообладатель Национальный институт образования

прымала роды, саромеецца за сваю рэўнасць: «Які ён дурань! Так кепска думаць пра Сашу!» Сапраўды, закаханыя пастаянна думаюць адно пра аднаго.

Сустрэўшыся пасля некалькіх месяцаў расстання, героі адзначаюць змены адно ў адным. Безумоўна, змяніўся статус Сашы: яна працуе, яна самастойная, яе паважаюць у акрузе. Але іншае і іх стаўленне да быту. «Пятро ў кожнай з'яве шукаў сімвалічнага. Дагэтуль ён ніколі не сядзеў з ёй за адным сталом». Нават такі факт яго хвалюе. Ніколі да таго яны не гаварылі пра грошы, а цяпер гавораць. Пятро, яшчэ студэнт, з некаторай трывогай фіксаваў меркантыльныя, на яго думку, змены ў Сашы, бо да гэтага яна здавалася яму ва ўсім незвычайнай, літаральна незямной, і не хацелася б, каб яна рабілася падобнай да іншых дзяўчат. А яна проста клапацілася пра яго.

Пятро ў іх першую сустрэчу на месцы працы Сашы адчуў сілу

«Наіўнае юнацтва! Табе здаецца, што ты выключнае, што ты самае разумнае, мудрае, не падобнае на ўсіх, і жаданні ў цябе недасягальныя! Не адразу да цябе прыходзіць разуменне, што “як усе” — гэта не дакор; мудрасць, разумнасць і чалавечая вартасць якраз у тым, каб раўняцца на ўсіх — на людзей, на калектыў, на чалавецтва. Не адразу ты пачынаеш разумець, што харáство не ў тваіх незямных марах, не ў тваім імкненні да выключнасці, а ў жыцці людзей і што людзі выпрацавалі самае прыгожае, высакароднае, карыснае, разумнае і ў навуцы, і ў мастацтве, і ў адносінах паміж сабой — у каханні, у сям'і. З разумення гэтых надзвычайна простых ісцін і пачынаецца твая сапраўдная сталасць, юнак».



Якія радкі з тэксту аповесці «Непаўторная вясна», на ваш погляд, сугучныя моманту, адлюстраванаму на карціне мастака Яўгена Вагнера?

*Я. Вагнер.* Сустрэча



Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Ахмеда Кітаева «На спатканні». Знайдзіце ў тэксце аповесці «Непаўторная вясна» і зачытайце радкі, якія, на вашу думку, найбольш адпавядаюць сюжэту карціны.



*А. Кітаеў*. На спатканні

яе характару, убачыў тое ў чалавеку, чаго не заўважаў падчас звычайных спатканняў закаханых у горадзе: тады гэта былі суцэльныя жарты, дэманстрацыя сваёй дасціпнасці, размовы пра прачытаныя кнігі, фільмы, вучобу, выкладчыкаў, сяброў (па ўспамінах Івана Шамякіна і яго жонкі).

Прычым і Саша баялася змен у сябры, хацела, каб ён заставаўся такім, якім быў у Гомелі, не жадала змянення іх адносін: «Я не хачу, каб ты стаў, як усе... я мару, каб ты заўсёды быў вось такі... далёкі, жыў у маіх марах — і ўсё. Я баюся, што, калі здарыцца інакш, гэта знішчыць усё светлае, што ў нашых адносінах, што ў маёй душы...» Для некаторых людзей жыццё ў марах больш прыцягальнае, чым рэальнае існаванне, і разбурэнне мар, умяшанне ў іх бытавыя праблемы яны ўспрымаюць пакутліва.

Усё змянілася вясной наступнага года, калі яны сталі мужам і жонкай. Героі пасталелі пад уплывам абставін жыцця. Саша ў вёсцы, на месцы сваёй працы, мела справу выключна з сямейнымі людзьмі. «Рэдка выпадала ноч, каб яе не выклікалі да парадзіхі». Гэта не дзіва, калі ўлічыць, што Саша працавала не на адну вёску, а на цэлы сельсавет, які ўключаў некалькі паселішчаў. Можна ўявіць, якая гэта была складаная і адказная праца.

Як ставіцца Саша Траянава да сваіх прафесійных абавязкаў?
Якія духоўныя і прафесійныя якасці, уласцівыя гераіні, вам імпануюць?



Правообладатель Национальный институт образования



Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Аркадзя Пластова «Юнацтва». Знайдзіце ў тэксце аповесці «Непаўторная вясна» эпізод, блізкі па настроі да твора мастака.

Вясну ў прыродзе можна суаднесці з юнацтвам чалавека. Чаму менавіта ў гэты час варта задумацца пра сваё месца ў жыцці, пра сэнс чалавечага жыцця?

*А. Пластоў.* Юнацтва

Але яна заканамерна прымушала маладога фельчара задумацца пра ўласнае жыццё. Акрамя таго, у такім напружаным рытме стала не да дзявочых мар. У Пятра інакш: агульная трывожная атмасфера часу міжволі звяртала да спрадвечных каштоўнасцей — перш за ўсё да сям'і. Быў і страх страціць Сашу, калі яна расказала, як сваталіся да яе і як сама яна прасілася на фінскую вайну.

Нярэдка ў аповесці аўтар да сваіх герояў, асабліва да Пятра, паблажліва-іранічны. Напрыклад, тады, калі паказвае, як проза жыцця ўсё ж не столькі разбурае, колькі «карэкціруе» юнацкую рамантыку. Атрымаўшы грошы ад Сашы, Пятро вырашае іх не траціць, пакінуць на памяць пра каханую, як бы ні скласіся ў іх адносіны. Ідуць узвышаныя, пафасныя разважанні маладога чалавека, які сам ганарыцца сваёй духоўнасцю. А потым — як іх вынік — стылёва зніжаная, не без унутранай усмешкі, канстатацыя рэалій жыцця: «Але абставіны прымусілі яго пазней парушыць зарок і купіць за гэтыя



Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Аляксандра Раманычава «Вясковы ўрач». Якім паказаў мастак вясковага ўрача? Ці ёсць на мастацкім палатне нешта агульнае з апісаннем вясковага фельчара Іванам Шамякіным? Зачытайце адпаведныя радкі з твора.

*А. Раманычаў.* Вясковы ўрач



Правообладатель Национальный институт образования

грошы сабе чаравікі, бо старыя за час падарожжа зусім стапталіся». Такая аўтарская манера І. Шамякіна: ён лірычны, калі непасрэдна ўмешваецца ў паведамленне, калі перадае пачуцці і думкі сваіх герояў, і ён жа — строгі рэаліст з нярэдка іранічным аповедам. Але і ў яго іроніі — любаванне сваімі героямі і сваёй маладой сям'ёй.

**Маральна-этычная праблематыка аповесці.** Героі аповесці — самыя звычайныя людзі, не пазбаўленыя недахопаў. Для іх, асабліва для Пятра, вельмі характэрны частыя змены пачуццяў. Прычым сам ён разумее, што бывае несправядлівым да каханай, адчувае, што дрэнныя думкі — ад нудоты: «...калі чалавеку няма чаго рабіць, то якія толькі думкі не прыходзяць у галаву». Пятро і залішне сарамлівы, а таму «нязграбны сярод людзей незнаёмых, асабліва ў прысутнасці дзяўчат і жанчын».

Калі Пятро вырашыў пайсці ад Сашы, ён пакутаваў, аж да слёз шкадаваў сябе. У далейшым, у іншых аповесцях пенталогіі, такога з ім ужо ніколі не здаралася: залішне многа даводзілася бачыць сапраўдных пакут. А магчыма, пазбавіўся эгаізму пад уплывам Сашы, якая ніколі не шкадавала сябе. Ідучы ад дзяўчыны, пераплываючы раку, Пятро нават хацеў, каб вузкі човен перакуліўся. «Не... загінуць яму зусім не хацелася, хоць і вялікая роспач была ў душы... Гэта трэба было яму для таго, каб потым як-небудзь падгледзець употайкі, як сустрэне вестку пра ягоную смерць Саша». У падобных развагах — і гульня перад самім сабой, і юнацкая наіўнасць.

Пятро — удзячны чалавек; яго заўсёдная гатоўнасць цаніць чалавечую цеплыню сведчыць, магчыма, пра недахоп у яго жыцці простай увагі і ласкавасці. У сям'і стрымана ставіліся адно да аднаго. Беларускія сяляне ўвогуле скупыя на пачуцці. Але галоўныя героі аповесці — маладыя інтэлігенты, якія навучыліся пастаянна разважаць і аналізаваць рэчаіснасць, у тым ліку ўласныя эмоцыі.

Наступны перыяд восені і зімы — расстанне Пятра і Сашы, якія зусім не бачыліся. У Пятра — цікавае і напружанае жыццё, і ў «гэтым водавароце ён часам забываўся на Сашу і пісаў ёй рэдка». Крыўды на яе не было, бо яна сама адразу, калі ён «нечакана і з крыўдай пайшоў ад яе», напісала яму «па-сяброўску шчыра і па-даросламу мудра». Саша разумела душу хлопца і не палічыла прыніжэннем для сябе



Правообладатель Национальный институт образования

папрасіць прабачэння, хоць не было за што. Пятро ўзрадаваўся. «Але разам з гэтай радасцю прыйшоў той самаўпэўнены спакой, які часта губіць нават гарачае пачуццё». Пятро хваліўся сябрам сваёй Сашай, але ўжо не думаў жаніцца. Тым больш што пачалася работа над дыпломным праектам. Каханне не знікла, але яно ўгняздзілася глыбока ў душы, адначасова выспяваючы, каб перайсці на новы якасны ўзровень.

Мудрая Саша зноў напісала яму, жартаўліва паграseverжаючы, што можа выйсці замуж, бо да яе сватаюцца. Гэта праўда: пра шлюб Сашы са сваім сынам гаварыла маці настаўніка, які сапраўды моцна сімпатызаваў дзяўчыне. Гэтыя абставіны прымусілі яе задумацца пра свой лёс, і з'явілася жаданне мець сям'ю, пра што Саша раней і не думала. Магчыма, адзінота стала ўрэшце невыноснай. Мець побач блізкага чалавека — натуральная патрэба для кожнай асобы. Вырашыўшы ехаць да Сашы, Пятро працаваў вельмі напружана і за некалькі дзён зрабіў па дыпломным праекце тое, што планаваў зрабіць за месяц. Але галоўнае — юнак захаваў вернасць пачуццю. А вернасць і чысціня — асноўныя рысы чалавека, па якіх вызначаецца яго маральная веліч і прыгажосць.

Сустрэча юнака і дзяўчыны наступнай вясной была больш спакойная, стрыманая, без кідання ў крайнасці, але менавіта таму, што пачуццё аказалася глыбокім, прайшло праверку часам. Яны зразумелі, што не могуць адно без аднаго. Яны навучыліся кахаць. І ўсё ж у шчаслівай для закаханых развязцы галоўную ролю адыграла Саша, яе жаночая праніклівасць, душэўная тонкасць. Яна з самага пачатку выяўляла больш розум, разважлівасць, сур'ёзнасць, чым рамантычны, імпульсіўны Пятро. Звыклая да выключна важнай і напружанай працы, Саша і больш адказная, акуратная ў адносінах не толькі да сваіх абавязкаў, але і да абавязкаў Пятра. Яна ўжо пачала ім кіраваць: першая нагадала пра яго ад'езд.

Вярнуўшыся ў тэхнікум, хлопец змяніўся.

> «Раней жартаўлівы і шумны сярод блізкіх сяброў, Пятро зрабіўся сцішаны і замкнёны. Замыкаюцца і адасабляюцца людзі звычайна ад гора, але бывае, што замыкаюцца часам і ад шчасця. Пятро як бы баяўся, каб хто не абразіў, не запляміў яго светлых і чыстых пачуццяў».



Правообладатель Национальный институт образования

Юнак адчуў сябе больш сталым, чым сябры. У нейкі момант героі нібы памяняліся ролямі. Пятро сапраўды значна пасталеў, а Саша, калі даведалася пра хваробу мужа, нягледзячы на жорсткі закон аб прагулах, панеслася да яго ў Гомель, каб даглядаць і дапамагаць. У дадзеным выпадку яна не думала пра асабістую небяспеку. Менавіта жаночая вернасць робіць гераіню вартай павагі і захаплення.

Герояў чакаюць драматычныя выпрабаванні, але дабрыня, пачуццё абавязку і вернасць дапамогуць пераадолець неверагодныя жыццёвыя цяжкасці ва ўмовах вайны і акупацыі. Урэшце, дапамогуць выжыць.

І яшчэ важная думка вынікае з назірання за пачуццямі маладых: паколькі яны шчырыя ў адносінах адно да аднаго, такія яны і ў адносінах да Радзімы. Сапраўды, выяўляюць патрыятызм толькі тыя людзі, якія здольны моцна і аддана любіць. Лепшыя свае якасці героі праявяць менавіта ў абставінах, калі прыйдзе час абараняць Радзіму.

**Лірычны характар аўтарскага пісьма.** Аповесць «Непаўторная вясна» лірычная і душэўная. Лірызм стварае сама аўтабіяграфічная аснова твора, які звернуты да мінулага, да памяці, да пачуццяў маладосці. Аўтар перажывае самыя значныя для сябе моманты жыцця. Часам ён непасрэдна выяўляе сябе ў тэксце, што якраз і стварае моцны лірычны струмень.

У Івана Шамякіна своеасабліва пададзены прастора і мастацкі час у творы. Паколькі аповесць ствараецца праз паўтара дзясятка гадоў пасля апісаных у ёй падзей, думка аўтара пастаянна імкнулася

Як суадносіцца карціна Леаніда Шылава «Развітанне» з падзеямі жыцця, з пачуццямі і перажываннямі герояў твора?



*Л. Шылаў*. Развітанне



Правообладатель Национальный институт образования

да цэласнага ахопу розных перыядаў гісторыі, прычым часта не без іроніі і самаіроніі. Напрыклад: «Добра, што ў наш шчаслівы час, калі ўсюды столькі машын, нават закаханыя паэты не ходзяць пехатой». Але часам і з тугою, настальгіяй: «...хаты танулі ў зяляніне садоў, якіх, на жаль, цяпер так мала — пасля ваенных пажараў». Успрыманне прасторы і часу як героем, так і аўтарам стварае асаблівы лірычны настрой твора. Нярэдка апісаныя падзеі адначасова, нават у адной фразе, адсылаюць да тых, што адбудуцца трохі ці значна пазней, — цягнуцца ніці ў будучыню. Гэта неабходна для таго, каб падкрэсліць асаблівую ролю аўтара, які глядзіць на сябе маладога і сваё пакаленне з трохі паблажлівай усмешкай, нярэдка з гумарам. Менавіта такі аўтарскі погляд не дазваляе збіцца на сентыментальнасць і меладраматызм, а лірызм, наадварот, паглыбляе. Вось як сумяшчае розныя часы аўтар: «...ён марудзіў і не пабег трыццаць кіламетраў пехатой адразу з цягніка, як часта рабіў гэта пазней».

> Чаму герой, думаючы пра каханую (літаральна ў першых сказах), не імкнецца да яе, а ўжо потым будзе марыць пра сустрэчу?

Лірызм твора вынікае і з яго тэмы, яго прысвячэння каханню. Аўтарская манера тут максімальна эмацыянальна насычаная. Прычым пачуцці герояў робяцца ўсё больш тонкімі. Так, перажываючы сваё шчасце, Пятро не можа заснуць. Ён любуецца Сашай, ён ловіць начныя гукі. Але не толькі радасць паглынае героя: «...яшчэ адно дзіўнае адчуванне не давала заснуць — нейкая неасэнсаваная трывога, нібы перад навальніцай ці перад невядомай далёкай дарогай. Яна, гэтая трывога, была недзе ў самай глыбіні душы, пад шчасцем і захапленнем, але чым настойлівей ён змагаўся з бяссонніцай, тым часцей яна адгукалася ў сэрцы, нібы прабіваючыся на паверхню. Што гэта? Чаму гэта?..»

Лірызму аповесці надае і **пейзаж**. Прычым прырода апісваецца на тых старонках, дзе Пятро падарожнічае да Сашы. Дарога — важнейшы матыў у творы. Невыпадкова, відаць, і тое, што Пятро вучыцца ў дарожным тэхнікуме. У сваім дыпломе ён праектаваў дарогу «з усімі неабходнымі пабудовамі: дамамі даглядчыкаў, гасцініцай, бензакалонкамі, рамонтнай майстэрняй — адным словам, такую дарогу, якая і да нашых дзён ёсць толькі ў праектах і аб якой і зараз


Правообладатель Национальный институт образования

Якая роля адведзена вобразу дарогі ў творы? Звярніцеся да рэпрадукцыі карціны Валерыя Шкарубы «Дарога». Што, на вашу думку, дазваляе суаднесці яе з аповесцю «Непаўторная вясна»?



*В. Шкаруба.* Дарога

марацьуласнікі машын і ўсе шафёры». Праўда, Пятро, як правіла, ходзіць да Сашы пешшу і нават не марыць пра ўласную машыну. Але затое ён марыць, што калі-небудзь пабудуе ў гонар Сашы дарогу па сваім праекце — «дарогу цудоўную, па якой прыемна і радасна будзе хадзіць людзям...»

**Дарога** ў творы — вобраз шматзначны. Шлях да каханай — адначасова шлях да ўласнага лёсу, шлях да разумення сябе, але і пазнанне Радзімы, магчымасць сузіраць і разважаць. Ды толькі сваё стаўленне да падарожжа выяўляе напачатку не герой, а зноў-такі аўтар: «Прайсці аднаму па добрай дарозе і ў добрым настроі — хіба не прыемна гэта? Колькі перадумаеш усяго, як хораша памарыш, паспрачаешся са сваімі праціўнікамі...» У іншым месцы, калі Пятро ў роспачы збег ад Сашы, аўтар зноў умешваецца ў аповед. Ён глядзіць на пейзаж вачыма Пятра, але разважае ўжо як дарослы, дасведчаны чалавек — гаворыць пра багацце мясціны: «Пясчаныя глебы, але затое колькі іншых выгод! Шырокія сенажаці, лясы, рэкі і азёры — старыкі. Трава і дрэва, рыба і звер — усё ёсць». А далей думка сягае ў гісторыю, культуру міжрэчнага, паміж Сожам і Дняпром, краю.

Дарога як адзін з важнейшых элементаў пейзажу раскрываецца перад маладым рамантыкам усімі сваімі нацыянальнымі асаблівасцямі. Прычым герой бачыць, убірае ў сваю памяць, у сваю свядомасць пейзаж, але аналізуе яго ў асноўным аўтар.

Аповесць «Непаўторная вясна» — твор аб радасці і пакутах кахання, аб тых перашкодах, што паўстаюць на шляху закаханых да поўнага шчасця. Шчасце ў герояў трывожнае — такім яно аказалася ў іх пакалення. Твор І. Шамякіна — і хроніка гістарычных падзей,


Правообладатель Национальный институт образования

> Тэма кахання найбагацейшая ў сусветнай літаратуры, таму што само пачуццё кахання вечнае і несмяротнае, пакуль існуе чалавек.

і летапіс чалавечых пачуццяў. Аўтар паказаў каханне па-свойму, «з такой глыбінёй, пранікнёнасцю і пераканальнасцю, што дае магчымасць перадаць хараство душы маладых герояў на парозе іх сталасці, раскрыць іх ідэалы, мары і тыя ўнутраныя сілы, якія дазволілі гэтым звычайным, радавым савецкім людзям вытрымаць самыя суровыя выпрабаванні ваеннага часу» *(Дзмітрый Бугаёў)*.

1. Якое месца займае аповесць «Непаўторная вясна» ў агульнай структуры пенталогіі «Трывожнае шчасце»?
2. Растлумачце сэнс назвы аповесці.
3. Якія гістарычныя падзеі паказаны ў аповесці? Якія рэаліі даваеннага жыцця могуць здзівіць сучаснага чытача? Пацвердзіце свой адказ радкамі з тэксту.
4. У якіх эпізодах вы заўважылі нарастанне «трывожнага шчасця» ў творы? Як пісьменнік гэтага дасягае?
5. Як складваюцца ўзаемаадносіны Пятра і Сашы? Якія змены адзначаюць героі адно ў адным у першую сустрэчу на месцы працы Сашы? Як змяніліся героі праз год? Прасачыце эвалюцыю ў паводзінах, светапоглядзе, глыбіні рамантычных пачуццяў.
6. Якія чалавечыя рысы прывабліваюць вас у героях аповесці?
7. Пакажыце, у чым выяўляецца лірызм твора.
8. У чым актуальнасць твора для сучаснай моладзі?
9. Ці можна ўзяць сям'ю Сашы Траянавай і Пятра Шапятовіча за прыклад? Ці хацелі б вы, каб у вашай сям'і былі такія ўзаемаадносіны, якія былі паміж Сашай і Пятром?
10. Суаднясіце цытатныя характарыстыкі з адпаведнымі персанажамі (трэнажор «Героі аповесці Івана Шамякіна “Непаўторная вясна”»).
11. Біяграфія — гэта апісанне жыцця. Але гэта заўсёды аповед, які ўвасабляецца, калі чалавек расказвае пра сваё ўласнае жыццё. Для прыгожага пісьменства «біяграфія» літаратурнага героя не менш важная, чым біяграфія рэальнага чалавека. Напішыце сачыненне, якое будзе складацца з біяграфій герояў (або аднаго з іх) аповесці «Непаўторная вясна».



Правообладатель Национальный институт образования